# ВЕЛІЧНАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ «ПАЎНОЧНЫХ АФІН» І ЯЕ ЛЁС

***А. І. Смолік,***
*загадчык кафедры культуралогіі БДУКМ,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

Вялікая, або Першая, сусветная вайна 1914–1918 гг., 100-годдзе якой спаўняецца ў бягучым годзе, выклікала маштабныя сацыяльна-палітычныя ўзрушэнні ва ўсім свеце. У яе былі ўцягнуты буйнейшыя краіны: Англія, Аўстра-Венгрыя, Аўстралія, ЗША, Італія, Расія, Сербія, Францыя, Турцыя, Японія і інш. Усяго ў ваенных дзеяннях за гады вайны прымалі ўдзел 33 дзяржавы і іх калоніі. Падлічана, што на франтах вайны загінула каля 10 млн. чал., 20 млн. было паранена, 10 млн. памерла ад голаду і хвароб [2, с. 475].

Тры гады ваенныя дзеянні адбываліся на тэрыторыі Беларусі. Наша краіна была падзелена на дзве зоны: адна – была занята расійскай арміяй, заходняя частка Беларусі была акупіравана немцамі і іх саюзнікамі. Значная частка беларускіх мужчын была мабілізавана ў расійскае войска, 70 тыс. з іх загінулі ў баях, яшчэ 60 тыс. мірных жыхароў беларускіх гарадоў і вёсак загінулі ў выніку бамбёжак, артылерыйскіх абстрэлаў і розных карных дзеянняў акупантаў. 50 тысяч беларусаў акупанты прымусова вывезлі ў Германію і Аўстра-Венгрыю, больш за 2 млн. сталі бежанцамі.

Вогненная віхура гэтай вайны апаліла не толькі людзей, яе ахвярамі сталі іх геніяльныя тварэнні. Гарэлі кніжныя зборы, мастацкія калекцыі і галерэі, руйнаваліся храмы і палацы. А. Швейцар, аналізучы вынікі Вялікай вайны, пісаў, што «Вайна зрабіла па-сапраўднаму актуальнай праблему нашай цывілізацыі, нашай культуры… Вынікам і доказам упадку культуры з’явіліся жахі вайны» [3, с. 155, 157].

Беларусь ў мінулыя стагоддзі была знакаміта сваімі замкамі, палацава-паркавымі комплексамі і сядзібамі, якія вылучаліся харастовм і непаўторнай прыгажосцю. Да шэдэўраў сусветнага дойлідства адносіўся Залескі палацава-паркавы комплекс, які вядомы яшчэ пад назвай «Паўночныя Афіны» [1, с. 218]. Помнік палацава-паркавай архітэктуры XVIII–XIX стст. належаў роду князёў Агінскіх гербу «Ляліва», а з 1802 г. яго ўладальнікам стаў знакаміты кампазітар, вядомы дыпламат і грамадскі дзеяч Міхал Клеафас Агінскі, які пераўтварыў Залессе ў сваю рэзідэнцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дарэчы, 2015 год ЮНЕСКА аб’явіла годам М. К. Агінскага з нагоды яго 250-гадовага юбілею і ў знак вялікага ўнёску ў развіццё сусветнай культуры і асветы.

Комплекс складаўся з дзвюх частак – старая сядзіба 1-й паловы XVIII ст. у стылі барока, якая, на жаль не захавалася, і новы палацава-паркавы ансамбль у стылі класіцызму, узведзены ў 1802–1805 гг. Віленскі губернскі архітэктар І. Пусэ і прафесар архітэктуры пры Віленскім універсітэце М. Шульц выбралі для стварэння ансамбля свабодную тэрыторыю паміж дзвюма рэчкамі, Бабрынкай і Рудзіцай, якія агібалі тэрыторыю рэзідэнцыі і неслі свае воды ў Вілію. Палац уяўляў сабой двухпавярховы мураваны Г-падобны будынак. Галоўны прамавугольны корпус палаца меў сіметрычна-восевую кампазіцыю з 2-павярховымі бакавымі павільёнамі і цэнтральнай мансардавай часткай, вылучанай 4-калонным дарычным порцікам і вежачкай з гадзіннікам. Заходняе крыло галоўнага фасада завяршалася 2-павярховым павільёнам.

Калі палац быў пабудаваны за чатыры гады, то стварэнне ансамбля ішло яшчэ на працягу амаль двух дзесяцігоддзяў. У наступныя пасля ўзвядзення палаца гады быў разбіты батанічны сад. К. Тышкевіч, які ў 1857 г. падчас чатырохмесячнай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі па р. Віліі наведаў сядзібу Агінскіх, адзначаў, што ў садзе «расліны найрадчэйшыя, прывезеныя з Вільні прыродазнаўцамі Юндзілам і Струмілам, не горшыя, чым у Шчорсаўскім батанічным садзе Храптовіча» [4, с. 82]. Меліся на тэрыторыі рэзідэнцыі дзве аранжарэі. Фасад першай быў раздзелены паўкалонамі і высокімі арачнымі вокнамі. Другая аранжарэя размяшчалася перпендыкулярна першай і мела над адным з фасадаў суцэльныя нахіленыя вокны.

Побач з палацам была ўзведзена 8-гранная капліца з шатровым дахам, інтэр’еры якой былі багата аздоблены архітэктурным жывапісам. Адным з элементаў ансамбля з’яўляўся шпацырны звярынец з дарожкамі, абсаджанымі дрэвамі і рознымі кветкамі. У звярынцы былі ўзведзены дзве мураваныя альтан-кі – паўкруглая з 4-калонным порцікам, высокімі шклянымі дзвярыма і авальнымі вокнамі і круглая 2-павярховая «кітайская» з драўляным бельведэрам і завяршэннем у выглядзе трох кветак. Яшчэ адзін звярынец з дзікімі жывёламі быў размешчаны за ракой Бабрынкай. Ён быў абнесены магутнай драўлянай агароджай.

Рэзідэнцыю аздабляў пейзажны парк у рамантычным стылі, які быў закладзены знакамітым садоўнікам Я. Пеўзнерам на абалонах р. Бабрынкі, абапал шпацырнага звярынца. Парк з’яўляўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эстэтычным аналогам навакольнага прыроднага ландшафту. У ім навакольныя лугі ўпрыгожваліся «партэрамі» кветак і кветкавымі клумбамі. Ад палаца і бачных кропак парка адкрываліся далёкія перспектывы на натуральныя пейзажы. Здавалася, што суседні лес, пойма ракі, возера – усё гэта бясконцая прыгажосць натуры.

Паркавыя кампазіцыі ў значнай ступені вызначаліся тапаграфіяй і геамарфалагічнымі ўмовамі мясцовасці. Так, у паніжанай паўночна-заходняй частцы меўся вялікі (2 га) вадаём з астравамі. На тэрасах паўночна-ўсходняй часткі парка былі сфарміраваны пейзажныя насаджэнні ў асноўным з ліпы і вяза. Парк перасякаўся цэнтральнай алеяй, якая была яго асноўным структурна-кампазіцыйным элементам. Акцэнтам перспектывы з’яўляўся заходні востраў з перакідным мосцікам. У парку была збудавана вежа са шпілем, некалькі рамантычных альтанак, якія называліся «святынямі», устаноўлены памятныя камяні ў гонар Т. Касцюшкі. Лічаць, што надпіс «Ценям Касцюшкі» на валуне высек сам М. К. Агінскі.

Сучаснікі графа былі пераканаі, што «Паўночныя Афіны» ўяўлялі сабой архітэктурна-паркавую дасканаласць і дзівосную прыгажосць. Нездарма тут заўсёды было шмат знакамітых гасцей. К. Тышкевіч пісаў, што ў розныя гады ў Залессі працяглы час гасцявалі дырэктар імператарскіх тэатраў В. Казлоўскі, вядомы іспанскі музыка Р. Эскудэра, італьянскі кампазітар Д. Паліяні, беларускі паэт А. Ходзька, часта туды наведваліся прафесары Віленскага ўніверсітэта. Прыгажосць палацава-паркавага ансамбля і асаблівая творчая атмасфера «Паўночных Афін» натхніла А.Ходзьку, які прысвяціў Залессю цудоўную паэму. У палацы, адзначаў граф Тышкевіч, адбываліся музычна-літаратурныя вечары з удзелам айчынных і замежных выканаўцаў, ствараліся і выконваліся музычныя творы [4, с. 83]. Менавіта тут князь Міхал стварыў свой знакаміты паланэз «Ля мінор», вядомы пад назвай «Развітанне з Радзімай».

У 1822 г. М. К. Агінскі ад’язджае ў Італію і больш ніколі не вернецца ў дарагія яго сэрцу «Афіны». На жаль, яго нашчадкі не здолелі належным чынам падтрымліваць і памнажаць велічную прыгажосць ансамбля. Палаца-паркавы комплекс паступова прыходзіць у запусценне, якое беспаваротна было паскорана Вялікай вайной.

Восенню 1915 г. сучасны Смаргонскі раён апынуўся ў эпіцэнтры бесперапынных жорсткіх баёў паміж рускай і нямецкімі ваеннымі групіроўкамі, якія доўжыліся каля месяца. 9 верасня германскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

войскі перайшлі ў наступленне з Усходняй Прусіі і Літвы ў напрамку на мястэчка Свянцяны. За тыдзень немцам удалося пацясніць ваенныя групіроўкі 5-й і 10-й армій, захапіць Вілейку і выйсці ў раён Смаргоні, падыйсці да Маладзечна і Смалявіч. Гэтая аперацыя ўвайшла ў ваенную гісторыю як «Свянцянскі прарыў», таму што германскія войскі прарвалі рускі фронт і значна паглыбіліся ў рускі тыл. У выніку прарыву расійскія арміі вымушаны былі адступіць амаль на сотню кіламетраў на ўсход. Звышчалавечымі намаганнямі з боку расійскіх салдат у пачатку кастрычніка прарыў быў ліквідаваны і фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск – воз. Нарач – Смаргонь – Баранавічы – Пінск.

У сакавіку 1916 г. пачалася так званая Нарачанская аперацыя, якая сваім чорным крылом зноў накрыла Смаргоншчыну. Тут самыя цяжкія кровапралітныя баі давялося весці групе расійскіх войск пад камандаваннем генерала П. С. Балуева. На фронце каля Смаргоні баі вяліся амаль два месяцы. Тут 810 дзён расійская армія стрымлівала немцаў, якія імкнуліся захапіць як мага большую частку тэрыторыі Беларусі. Дарэчы, у абароне Смаргоні ўдзельнічалі будучыя класікі рускай літаратуры М. Зошчанка і В. Катаеў. Генштаб Стаўкі ў Магілёве дрэнна падрыхтаваў аперацыю, няўдала быў выбраны час наступлення, у разгар вясновай паводкі. Мясцовасць ператварылася ў скразныя балоты і азёры, што перашкаджала руху войска і артылерыі. У дадатак немцы нечакана выкарыстані снарады з удушлівым газам, ад якога ў расійскіх салдат не было сродкаў засцярогі. На гэтым участку фронта была таксама апрабавана новая германская зброя, агнямёты, з якімі расійскія афіцэры і салдаты сутыкнуліся ўпершыню.

У выніку разглядаемых ваенных аперацый вельмі пацярпелі населеныя пункты Смаргоншчыны, у тым ліку і Залессе. Маёнтак быў пераабсталяваны ў шпіталь 10-й расійскай арміі. Інтэр’ер быў значна пашкоджаны. Рэдкія дрэвы парка выкарыстоўваліся на паліва і як матэрыял для будаўніцтва зямлянак, умацаванняў траншэй і акопаў. Адсутнасць нагляду і належнага дагляду за палацам, капліцай, альтанкамі, вадаёмамі і паркам адмоўна адбілася на знешнім і ўнутраным выглядзе ансамбля.

Яшчэ большыя страты палацава-паркаваму комплексу нанесла савецка-польская вайна 1919–1920 гг. У выніку акупацыі маёнтка была назаўсёды страчана 1/3 частка ўсяго кошту сядзібы. Разбурэнне працягвалася і ў савецкі перыяд. Духоўнае ўбоства тагачасных прадстаўнікоў мясцовых улад прывяло да таго, што ў 1939 г. маёмасць палацава-паркавага комплексу была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыяналізавана, па сутнасці разрабавана. Будынкі маёнтка былі прыстасавны пад калгасную стайню і трактарны стан. У былым палацы некалькі дзесяцігоддзяў месціўся дом для састарэлых.

Такі сумны лёс склаўся ў некалі чароўнай прыгажосці «Паўночных Афін». Мастацтвазнаўцы лічаць, што Залескі палаца-паркавы комплекс па сваёй значнасці раўняецца «Яснай Паляне» Л. Талстога, «Міхайлаўскаму» А. Пушкіна, «Карабіхе» А. Някрасава. У 1990-х гг. пачаліся работы па адраджэнні былой рэзідэнцыі славутага кампазітара. Сёння ўжо адбудавана каплічка, на старым падмурку ўзведзены вадзяны млын, адноўлена адна аранжарэя, вядзецца рэстаўрацыя палаца. Адпаведна Праекту рэстаўрацыі, які выкананы мінскім унітарным прадпрыемствам «Праектрэстаўрацыя», мяркуецца, што на першым паверсе будзе адноўлены інтэр’ер XIX ст. і тут будзе разгорнута экспазіцыя музея. Музейнай экспазіцыі таксама аддадуць і крыло, у якім у часы М. Агінскага была аранжарэя. У палацы з’явіцца музычна-тэатральная зала. Палацава-паркавы ансамбль у Залессі ўключаны ў Дзяржаўную праграму рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў Беларусі. Будзем спадзявацца, што да юбілею М. Агінскага значная частка рэстаўрацыйных работ будзе выканана.

Такіх страчаных палацава-паркавых ансамбляў і сядзібна-паркавых комплексаў на Беларусі вельмі многа. Большасць з іх сталі ахвярамі шматлікіх войнаў і духоўнага людского ўбоства. Дзякуй Богу! У апошнія гады сітуацыя змяняецца ў лепшы бок. Пачалося паступовае вяртанне з імглы забыцця нашай культурнай спадчыны. Адрэстаўраваны Нясвіжскі палацава-паркавы ансамбль, Мірскі і Лідскі замкі. Працэс гэты складаны і не хуткі, але галоўнае, што беларусы прыйшлі да разумення неабходнасці зберажэння сваёй спрадвечнай культуры, выхавання на яе традыцыях маладога пакалення. Спадзяемся, што і іншыя помнікі палацава-паркавага мастацтва ў недалёкай будучыні паўстануць з попелу.

1. Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. энцыкл. ; рэдкал. : А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – 620 с. : іл.

2. *Сідарэвіч, А.* Першая сусветная вайна (1914–1918) / А. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Т. 5. М – Пуд / Беларус. энцыкл. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск : БелЭн, 1999. – С. 472–476.

3. *Швейцер, А.* Упадок и возрождение культуры / А. Швейцер // Избр. произв. – М. : Прометей, 1993. – 512 с.

4. *Tyszkiewicz, Hr. Konstanty.* Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty Tyszkiewicz. – Vilnius, 2008. – 362 c.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ